**І.А.Малахава,** *дацэнт*

# МАСТАЦКА-ТВОРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ АСОБЫ Ў САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ СФЕРЫ: ТЭАРЭТЫЧНЫ АСПЕКТ

Будучы спецыфічным відам грамадскай дзейнасці, сацыяльна-культурная работа характарызуецца тым, што яна ажыццяўляецца ў вольны час, з'яўляецца добраахвотнай, адрозніваецца актыўнасцю асобы, разнастайнасцю і асобаснай накіраванасцю, абумоўлена нацыянальна-этнічнымі традыцыямі, мае гуманістычны і развіваючы характар. Асаблівую ролю ў сацыякультурнай сферы адыгрываюць мастацтва, мастацка-творчая дзейнасць асобы. Назапашаныя факты, назіранні асобных педагогаў, даныя, атрыманыя айчыннымі і замежнымі даследчыкамі, дазваляюць выказаць меркаванне, што мастацкая дзейнасць дабратворна ўплывае на развіццё інтэлектуальных і творчых здольнасцей чалавека. Таму далучэнне да мастацтва неабходна менавіта ў якасці перадумовы аднаго з магутнейшых сродкаў уздзеяння на станаўленне і развіццё асобы.

Працэс мастацкага выхавання ўяўляе сабой спалучэнне трох асноўных відаў дзейнасці: знаёмства з мастацкімі творамі (спажыванне мастацтва), набыццё мастацтвазнаўчых ведаў і ўласна мастацкая творчасць.

Разглядаючы мастацтва як сродак стымулявання вобразнага мыслення, духоўнага ўзбагачэння, эмацыянальнай разрадкі і каталізатара патрэбнасцей у самых розных відах творчасці, у большасці выпадкаў выпадаюць з поля зроку вынікі зносін чалавека з мастацтвам, функцыі мастацтва ў агульным развіцці асобы. Таму на сучасным этапе развіцця навуковай думкі вывучэнне псіхолага-педагагічных механізмаў фарміравання асобы сродкамі мастацтва – востра актуальная праблема мастацкага выхавання, вырашэнне якой дазволіць пазбавіцца ад многіх супярэчнасцей рэчаіснасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спецыфічная роля мастацтва ў фарміраванні светапогляду адзначалася многімі даследчыкамі. Так, Л.Выгоцкі лічыў, што менавіта пад уплывам мастацтва самыя патаемныя сферы асобы прыцягваюцца да працэсу ажыццяўлення сацыяльных мэт і задач. Паколькі мастацтва ўяўляе своеасаблівую мадэль чалавечай культуры, канцэнтраванае выражэнне ідэалу эпохі, таму прыцягненне асобы да мастацкіх каштоўнасцей садзейнічае развіццю патрэбнасці ў актыўнай дзейнасці па законах прыгажосці. Гэтая патрэбнасць у практычным дзеянні і актыўна-творчыя адносіны да жыцця найбольш поўна рэалізуюцца ў мастацка-творчай дзейнасці. У вызначэнні названай дзейнасці як тэрміна мы абапіраліся на думку Я.Д.Грыгаровіч. Яна пад мастацка-творчай дзейнасцю разумее асобую форму стваральнай прадуктыўнай дзейнасці па законах прыгажосці ў галіне розных відаў мастацтва, якая адпавядае патрабаванням эстэтычнага выхавання і адукацыі і накіравана на выхаванне гарманічна развітой асобы. Вельмі актуальным з'яўляецца ўключэнне ў мастацка-творчую дзейнасць дзяцей і падлеткаў.

Удзел школьнікаў у мастацка-творчай дзейнасці прадугледжвае развіццё актыўнасці, самастойнасці мыслення, уяўлення, выхаванне эмацыянальнай і валявой сфер у працэсе зносін з мастацтвам. Набыццё ведаў, развіццё ўменняў і навыкаў у галіне мастацкай дзейнасці ажыццяўляюцца з улікам фарміравання ў дзяцей патрэбнасці і праяўлення здольнасці самастойна вырашаць творчыя задачы, што стымулюе і развіццё крэатыўнасці.

Такім чынам, далучэнне навучэнцаў да мастацтва ў самых розных формах, асабліва ў форме мастацка-творчай дзейнасці, з'яўляецца актуальнай задачай сучаснай сістэмы выхавання і адукацыі галоўным чынам таму, што ў працэсе мастацкай дзейнасці развіваецца крэатыўнасць як агульная універсальная здольнасць да творчасці, неабходная для паспяховай рэалізацыі любой прадуктыўнай дзейнасці; усведамляецца сутнасць працэсу стварэння мастацкага твора, яго ідэй і думак; паглыбляецца вывучэнне праграмнага матэрыялу прадметаў эстэтычнага цыкла; павышаецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзровень духоўнай культуры асобы; эфектыўна і плённа ажыццяўляецца працэс самаразвіцця, самавыхавання і самаактуалізацыі асобы вучня.

Як вядома, мастацкая творчасць – з'ява шматаблічная і разнастайная, яна прыцягвае да сябе ўвагу прадстаўнікоў многіх навук, якія вывучаюць розныя пытанні яе існавання. Адной з характэрных асаблівасцей сучаснай навуковай думкі з'яўляецца адсутнасць тэрміналагічнага адзінства па праблеме формаў мастацкай творчасці, а дакладней, па пытанні назваў гэтых формаў, а значыць, і прызначэння кожнай з іх у жыцці чалавека. Мы згодныя з тымі навукоўцамі, якія лічаць, што існуюць наступныя асноўныя формы мастацкай творчасці: прафесійнае мастацтва, фальклорнае мастацтва і аматарская творчасць. Кожная з іх дзеліцца на жанры, віды, кірункі, мае дакладна вызначаныя тыпалагічныя асаблівасці, свой механізм функцыянавання і адлюстроўвае розныя бакі духоўнага жыцця.

Значыць, палеміка ў навуцы аб «чысціні» тэрміналогіі зводзіцца перш за ўсё да высвятлення сутнасці той з'явы, што да нядаўняга часу называлася «самадзейнай мастацкай творчасцю» ці «мастацкай самадзейнасцю», і ў цяперашні час неадэкватна адлюстроўвае рэчаіснасць. Разгледзім гістарычную рэтраспектыву гэтай з'явы.

Мастацтва, узнікшы на пачатковых стадыях развіцця грамадства, з першых сваіх крокаў было звязана з задавальненнем мастацка-творчых патрэбнасцей першабытнага чалавека. Больш таго, усе асаблівасці станаўлення і развіцця мастацкай творчасці абумоўлены канкрэтнымі сацыяльнымі ўмовамі, пануючай сістэмай вытворчасці матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, а таксама той роляй, якую само мастацтва адыгрывае ў жыцці людзей. Логіка развіцця мастацкай творчасці як адной з падсістэм духоўнай вытворчасці абумоўліваецца спосабам вытворчасці. Мастацтва ў гэты перыяд характарызуецца наступнымі якасцямі: прастатой перадачы думак і пачуццяў, непасрэднай сувяззю з працай і побытам, традыцыйнасцю тэм, безыменнасцю, вуснай формай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

перадачы, сінкрэтычнасцю. Такім чынам, першая форма існавання мастацтва ў адпаведнасці з названымі характарыстыкамі падобная да фальклорнай творчасці.

У працэсе гістарычнага развіцця кожная сацыяльная група выпрацоўвала самабытныя формы мастацкай творчасці, карані якой – у фальклоры і яго традыцыях. Так, пад моцным уплывам сацыяльных фактараў (грамадскі падзел працы, з'яўленне новых класаў і сацыяльных груп, узмацненне антаганістычных супярэчнасцей у грамадстве і інш.) ад фальклору аддзяляецца і на яго аснове развіваецца прафесійнае мастацтва, а потым і аматарская творчасць. Паступова кожная з гэтых формаў узбагачаецца новымі жанрамі і відамі, набываючы непаўторныя рысы.

Неабходна нагадаць, што многія даследчыкі адзначаюць розныя асаблівасці фальклорнай творчасці, але галоўнай прызнаецца самадзейны характар як спосаб свабоднай і нерэгламентаванай праявы асобы, як свабодная ігра фізічных і духоўных сіл чалавека, калі ён стварае па законах прыгажосці. С.І.Ожэгаў у «Словаре русского языка» адзначае, што самадзейнасць характарызуецца праяўленнем уласнай ініцыятывы ў якой-небудзь справе і што гэта непрафесійная, тэатральная, выканаўчая, мастацкая дзейнасць.

Значыць, самадзейнасць уяўляе сабой не які-небудзь від дзейнасці, а характарызуе ўсякую дзейнасць чалавека. Гэта якасць прысутнічае ў той ці іншай ступені ў дзейнасці чалавека наогул. Яна можа быць абмежавана, па-рознаму праяўляецца ў тых ці іншых сферах сацыяльнай практыкі – мастацкай, навуковай, тэхнічнай, але ў любым выпадку яна з'яўляецца характарыстыкай, выяўленнем самой дзейнасці як працэсу, а не відам дзейнасці, у прыватнасці мастацтва.

Тэрмін «аматарства» ўзнік у XVIII ст. Яго ўзнікненне сведчыць аб тым, што індывідуальная жыццядзейнасць падзялілася на свабодныя заняткі, якія «прыемныя самі па сабе» (Кант), і «працу», тое неабходнае, якое можа быць «само па сабе непрыемна (цяжка) і прываблівае толькі сваім вынікам, значыць, да такіх заняткаў можна прымусіць» (Кант). Сэнс аматарства як заняткаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заснаваных на самадзейнасці, раскрываецца часткова ў сэнсе слова. У яго значэнні заключаецца ўказанне на тое, што чалавек «любіць» (лац. amare – любіць) сваю дзейнасць, адчувае ўнутраную патрэбу ў ёй як у творчым самавыяўленні сваёй індывідуальнасці. У адпаведнасці з названым слоўнікам С.І.Ожэгава аматар – чалавек, які займаецца чым-небудзь у вольны час не як прафесіянал.

Значыць, аматарскі пачатак у мастацкай дзейнасці з'яўляецца вядучым матывам, сутнаснай рысай, якая прысутнічае на ўсіх этапах развіцця мастацтва і належыць розным яго відам. Акрамя таго, у вядомы гістарычны перыяд аматарскі пачатак у мастацкай дзейнасці лакалізаваўся ў вядучую форму мастацкай творчасці, што атрымала назву «аматарскае мастацтва», ці «аматарская творчасць».

Такім чынам, разглядаючы мастацтва як сродак развіцця крэатыўнасці асобы, нельга абысці ўвагай існаванне разнастайнасці яго жанраў і відаў, а таксама трох яго формаў: прафесійная, аматарская, фальклорная. Кожная з іх мае сваю спецыфіку, асаблівасці, якасныя характарыстыкі, механізмы функцыянавання. Аднак з пункту гледжання выхаваўчага ўздзеяння на асобу, развіцця крэатыўнасці можна адзначыць ідэнтычнасць праяў гэтых трох формаў. Таму мастацтва, мастацкую дзейнасць мы і разглядаем у кантэксце разнастайнасці відаў і жанраў, а таксама спецыфікі ўздзеяння асобных яго відаў на асобу. У гэтым сэнсе сацыякультурная сфера мае вялікія магчымасці і перспектывы ў выхаваўчым працэсе сродкамі мастацтва, асабліва яго аматарская форма.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ